# БЕЛАРУСКІ ЧАС

4 САКАВІКА 2023 г

#12

ПРАЧЫТАЎ САМ – ДАЙ ПРАЧЫТАЦЬ ІНШАМУ





# ІШОЎ ДРУГІ ГОД ВАЙНЫ

Прайшоў год, як Расія абвесціла, што распачынае «спецыяльную военную аперацыю» ва Украіне — нібыта будзе вычышчаць краіну ад нацыстаў, ратаваць свет ад бэндэраўцаў. У Беларусі і да гэтага праблем хапала, яшчэ не да канца з наступствамі выбараў 2020 разабраліся. А тут раптам вайна, у баку застацца не атрымалася — занадта вялікая залежнасць ад Расіі. І фінансавая — пазыкі вялізныя, і палітычная — Лукашэнка разумее, што без падтрымкі Крамля згубіць трон вельмі хутка. Таму ён абраў бок Расіі, а народ паставіў перад фактам.

### Антываенныя пратэсты

Сваю пазіцыю сапраўдныя беларусы акрэслілі ў першыя дні вайны выхадам на антываенныя мітынгі і пікеты.Рэакцыя ўлад на гэта была вельмі жорсткай. Найбуйнейшы антываенны пратэст адбыўся ў дні рэферэндуму 27-28 лютага 2022 года. Па інфармацыі праваабаронцаў «Вясны», было затрымана не менш за 1100 чалавек, з якіх каля 600 былі арыштаваныя.

Беларусы не хочуць ваяваць на баку Расіі, станавіцца суагрэсарамі, таму пратэсты, якія пачаліся з першых дзён вайны, працягваюцца ўвесь час. Недапушчальна, каб на Кіеў ляцелі снарады з нашай зямлі, уздымаліся самалёты-бамбардзіроўшчыкі, ішлі эшэлоны з ваеннай тэхнікай.

Улады ж робяць выгляд, што так і трэба: даюць аэрадромы, вайсковыя базы, выконваюць вайсковыя замовы на рамонт тэхнікі, лечаць параненых у нашых шпіталях. Па тэлевізары ўсё выглядае выдатна.

Улады Украіны добра разумеюць, што Лукашэнка і беларускі народ маюць супрацьлеглую пазіцыю.

*— Беларусы пакуль не паддаюцца, у іх няма ніякага жадання ваяваць з намі. І тое, што яны сёння не прымаюць непасрэднага ўдзелу ва ўзброенай агрэсіі, менавіта Узброеныя сілы Беларусі, мы гэта належным чынам цэнім,* — сказаў сакратар Рады нацыянальнай бяспекі і абароны Украіны Аляксей Данілаў.

### Антываенны супраціў

У адказ на тое, што ўрад краіны прадставіў расіянам сваю тэрыторыю для нападу на Украіну, сапраўдныя беларусы не засталіся ў баку. Першымі ўступілі ў барацьбу «Рэйкавыя партызаны». На чыгунцы было здзейснена не менш за дванаццаць арганізаваных акцый сабатажу. На сёння вядомыя імёны адзінаццаці арыштаваных «рэйкавых партызанаў» і жанчыны, якая ім дапамагла. Усе яны атрымалі велізарныя тэрміны — ад 11 да 23 гадоў турмы.

Партызаны дабраліся і да расійскіх ваенных самалётаў — моцна пашкодзілі А-50, які карэктаваў навядзенне ракетных удараў па Украіне. Акрамя гэтага, беларусы ўвесь час дасылаюць інфармацыю аб перасоўванні расійскіх вайсковых эшэлонаў і тэхнікі ў адмысловыя тэлеграм-чаты «Беларускі Гаюн» ды іншыя, што моцна дапамагае ўкраінскай выведцы.

### Украіна і Расія: як жывуць простыя людзі

Ва Украіне на месцы дамоў, разбураных падчас масавых абстрэлаў расійскай арміяй, мясцовыя жыхары разбіраюць завалы. Людзі становяцца ў чэргі і перадаюць адзін аднаму цэглу. Прыносяць ежу, ваду, цёплую вопратку. Так было ў Кіеве, Дняпры, Харкаве, практычна ва ўсіх абстраляных гарадах і вёсках. Вайна аб'яднала ўкраінцаў у барацьбе з агульным ворагам.

Крамлёўскія ж нелюдзі бязлітасна падрывалі сваіх людзей у Маскве, Буйнакску, Валгадонску і выдавалі ўсё гэта за тэракты, каб адцягнуць увагу ад сур'ёзных праблем у дзяржаве. Але адзінства нацыі за стольки год так і не адбылося — кожны глядзіць у свой бок. Пакорліва адпраўляюць сыноў на вайну, каб атрымаць груз-200, а потым купіць «Ладу-Каліну» за «пахавальныя».

### Нафтавы/газавы шантаж

«Перакрыем трубу» — колькі гадоў запар расейцы палохалі Еўропу, што пакінуць без газа і нафты. Перакрылі, але не напалохалі. Яшчэ ў 2015 годзе расійская нафта складала амаль 100% сыравіны, якая перапрацоўвалася на заводах польскай кампаніі Orlen. Але з пачатку вайны расійскай нафты ў Польшчы амаль не засталося. *«Гэта вынік інтэнсіўных намаганняў па дыверсіфікацыі паставак»*, — адзначылі ў кампаніі. Аналагічна робяць і іншыя краіны ЕЗ, якія пастаўляюць нафту марскім шляхам з Паўночнага мора, Заходняй Афрыкі, Міжземнаморскага басейна, а таксама Персідскага і Мексіканскага заліваў.

### А што далей?

*«Украінцы прачнуліся ад гукаў сірэн і выбухаў ракет. А беларусы — з адказнасцю, што гэтыя ракеты ляцяць з тэрыторыі нашай краіны. Хаця мы супраць гэтай вайны,* — сказала лідэр дэмакратычных сіл Святлана Ціханоўская ў гадавіну вайны.— *Мы вывучылі, што ў нас ёсць і свае нацыянальныя інтарэсы. Зразумелі, што часам трэба не толькі дапамагчы іншаму, але і абараніць сваё».*

Гэта не толькі ўгодкі вайны, гэта яшчэ і сыход зімы. Украіна не замерзла, і, нягледзячы на сотні ракет, не пагрузілася ў цемру. Украінцы абараняюць святое — сваю Радзіму. Не замерзла і Еўропа, хоць расейцы і рабілі мноства пранікнёных відэа пра будучыя нягоды еўрапейцаў без расійскіх нафты і газу. Эканоміка што Расіі, што Беларусі пікіруе, як той бамбардзіроўшчык.

Лукашэнка яшчэ восенню на камеру сёк дровы, каб адасланць іх ў Польшчу, а сёння выглядае, як упаляваны воўк. Ён доўга гуляўся на мяжы вайны і міру, балансаваў на краі ляза, каб і Расію падтрымаць, і выглядаць міратворцам. Але мяжа ўжо пяройдзена. Вясна блізка.

# ЧТО ПРОИЗОШЛО В МАЧУЛИЩАХ



Российский самолёт ДРЛО А-50У

26 февраля с самого утра начала поступать информация об активности ГАИ и ВВ в районе аэродрома «Мачулищи». Оказалось, что в Мачулищах в результате двух взрывов получил значительные повреждения самолёт ДРЛО А-50У ВКС РФ: повреждены передняя и центральная части самолёта, авионика и радиолокационная антенна.

Этот самолёт занимался разведкой украинской территории и помогал наводить ракеты. В воздушно-космических силах РФ находится всего 9 таких самолётов, причём усовершенствованных (с модификацией «У») всего 6 единиц. Стоимость одного такого самолёта составляет $330 млн. Повреждённый самолёт А-50 стал самой крупной военной потерей России после крейсера «Москва», совершившего отрицательное всплытие в прошлом апреле, считает немецкий канал ZDF.

Как атаковали самолёт, рассказал глава объединения BYPOL Александр Азаров. По его словам, операцию готовили несколько месяцев: *«Гэта былі дроны. Удзельнікі аперацыі — беларусы, удзельнікі плана «Перамога». Усе выехалі, хай цяпер шукаюць вецер у полі».*

«Отличной новостью» назвал сообщение о повреждении российского самолёта А-50 на аэродроме в Мачулищах представитель Воздушных сил Украины Юрий Игнат в эфире национального телемарафона.

Пресс-секретарь Путина Дмитрий Песков не стал комментировать ситуацию. Официальных комментариев со стороны Минска также не поступало. Однако после инцидента Лукашенко провёл узкое совещание с силовиками, где присутствовали Госсекретарь Совбеза, министры внутренних дел и обороны, председатели КГБ и Госпогранкомитета РБ.

Вечером 26 февраля произошли задержания в городе Фаниполь, который находится в 30 километрах от военного аэродрома в Мачулищах. По данным правозащитников, силовики начали отрабатывать соцсети, чтобы выявить тех, кто комментирует информацию о предполагаемой атаке дронов на российский самолёт. Вечером в Мачулищах задержали девушку. Причины задержания и местонахождение Кристины Максименко неизвестны. BYPOL предупреждает, что силовики ищут тех, кто пишет негативные, по их мнению, комментарии о взрывах. Будьте осторожны!

# АВАРИЯ ПОД СМОЛЕВИЧАМИ УНЕСЛА 11 ЖИЗНЕЙ



Ежегодно на дорогах Беларуси погибает 550-600 человек и тысячи становятся инвалидами. Это астрономическая цифра! И это при том, что в РБ одно из самых низких в Европе количество машин на душу населения!

Год 2023 только начался, а сводки ГАИ снова пестрят новостями о смертях и увечьях беларусов в ДТП. Только одних аварий со смертельным исходом за последнюю неделю в стране случилось четыре, погибли 16 человек.

Самая страшная из этих 4 аварий — 20 февраля в Смолевичском районе, где произошло лобовое столкновение маршрутки и выехавшего на встречную полосу самосвала, гружённого песком. Удар был такой силы, что людей выбросило из маршрутки, и они лежали на дороге. Погибли 11 человек (среди них 2 школьника и одна многодетная мать). 9 пострадавших находятся в реанимации, 5 из них (в том числе дети) — в крайне тяжёлом состоянии.

Судя по всему, главной причиной трагедии стало плохое состояние полотна на участке. Наши власти любят ставить себе в заслугу якобы «идеальные» дороги в Беларуси. Однако на деле за их состоянием у нас следят только там, где ездит Лукашенко и начальство. А остальные дороги ремонтируют по принципу «и так сойдёт».

Инна Мороз (местный житель): *«Я живу там рядом, езжу с детьми в школу в Смолевичи по этой дороге! Дорога там фронтовая, разбитая, по краям сплошные ямы и провалы. Рядом карьер, тяжёлые МАЗы ездят целыми днями, часто выезжают на встречную полосу, чтобы объехать многочисленные ямы. Неоднократно звонила в дорожную службу 125, что дорога в аварийном состоянии. Но толку нет. Изредка приедут рабочие, лопатами присыплют ямки, и всё. Хватает лишь на 2-3 дня. Я сегодня как раз ехала по этой дороге за дочкой в школу, снова набрала в 125 и умоляла прислать дорожную службу, чтобы не случилось беды! Сказали,что передадут просьбу, как обычно... А через час узнала об этом ужасе....»*

Также выяснилось, что маршрутка была переполнена — местные дети последнее время ездили на ней в школу, так как школьный автобус почему-то был отменён.

Печально, что у нас в Беларуси всегда есть деньги на дворцы Лукашенко, на роскошный отпуск его семьи на экзотических островах, на обеспечение находящейся у нас в стране российской армии, которую мы кормим и одеваем за наш счёт. А вот на ремонт дорог, по которым ездят простые беларусы, и на школьные автобусы — денег нет. И многим сотням беларусов ежегодно приходится платить за это своими жизнями.

# РОССИЯ ПРИНУДИТЕЛЬНО УВЕЗЛА СОТНИ ТЫСЯЧ УКРАИНСКИХ ДЕТЕЙ

Каждый день тысячи украинцев ищут в соцсетях своих детей, с которыми их разлучила война. Одни потерялись во время обстрелов или бомбёжек, других с оккупированных территорий вывезли в Россию якобы «на оздоровление» или «в эвакуацию» и не пускают назад.

За год войны из Украины россияне насильно вывезли около 300 тысяч детей (по данным Украины), Россия называет цифру ещё больше — 700 тысяч. С точки зрения международного права насильственная депортация детей в страну-агрессора считается военным преступлением.

Российская сторона уверяет, что украинские дети временно вывезены в безопасное место, однако не даёт их фамилий и местонахождения. То есть Россия не заинтересована в том, чтобы «эвакуированные» дети нашли свои родные семьи. Похищенных детей пытаются максимально распределить по всей территории России, чтобы их было сложнее найти. Вывозят как сирот из детских домов, так и детей из семей без согласия родственников.

...10-летний Илья Матвиенко вместе с мамой Натальей бежал от бомбёжек в Мариуполе и попал под обстрел. Женщина была ранена в голову. Несмотря на тяжёлую травму, она всё же довела сына до дома знакомой, где и умерла. Оккупанты вывезли мальчика из Украины в российский Ростов. Бабушка с трудом разыскала его через 8 месяцев, ей пришлось добираться в Россию через 4 страны, но мальчика ей не отдали, сказали, что ему будет лучше здесь и ему назначат российского опекуна.



РФ сначала собственноручно делает детей сиротами, убивая их родителей и членов семьи снарядами, разъединяет их семьи, лишает их права учиться и расти на Родине, разрушая школы и гражданскую инфраструктуру городов и посёлков, а потом великодушно «спасает» их, устраивая к посторонним людям на чужбине!

По российским законам иностранные несовершеннолетние не могут усыновляться российскими семьями. Но в законодательство быстро внесли поправки для упрощённой выдачи детям гражданства РФ для их усыновления в России, а с усыновителями проводится идеологическая работа, чтобы они внушали детям, что Украина «плохая», а Россия их «спасла». К слову, в самой России около полумиллиона сирот, которых почему-то никто не спешит усыновлять!

Это очень напоминает случаи, когда во время Второй мировой войны гитлеровцы насильно вывозили в Германию детей из СССР, Польши, Чехии и других оккупированных ими стран, пытались сделать из них патриотов Германии, верных фюреру, заставляли их забыть свою родину, родителей, язык... Следы многих детей после войны так и не удалось отыскать. Именно по этому пути и идёт сейчас Россия. Это и есть нацизм.

## НАВІНЫ ВАЙНЫ

У снежні Лукашэнка паведаміў, што расійскія «Іскандэры» і С-400 заступілі на баявое дзяжурства ў РБ і падзякаваў Крамлю за перададзенае ўзбраенне. У Паветраных сілах Украіны заявілі, што размяшчэнне ракетных комплексаў у Беларусі акупанты спрабуюць растлумачыць нібыта абаронай яе паветранай прасторы.



Частка кабіны ў роліку была размытая

Але, верагодна, армія Беларусі эксплуатуе аператыўна-тактычныя ракетныя комплексы «Іскандэр», якія Расія раней выкарыстоўвала для абстрэлаў Украіны. 24 лютага Мінабароны Беларусі апублікавала відэа, на якім ракетнае падраздзяленне высунулася ў прызначаны раён. Пры гэтым частка кабіны «Іскандэраў» у роліку была размытая, каб схаваць чырвоныя зоркі, кожная з якіх пазначае адзін баявы пуск.

Гэта значыць, што войску Беларусі перадалі не новыя «Іскандэры», а тыя, якія знаходзіліся ў эксплуатацыі арміі РФ. Пазней, 25 лютага, беларускае Мінабароны апублікавала фота «Іскандэра» без размыцця з чырвонымі зоркамі, бартавым і рэгістрацыйным нумарамі.

Таксама беларускае войска «ў рамках мерапрыемстваў баявой



Зоркі на «Іскандэры»

гатоўнасці» разгортвае адно з ракетных падраздзяленняў. Аб падрыхтоўцы падраздзялення да баявога прымянення тэхнікі было аб'яўлена 24 лютага — роўна праз год пасля таго, як РФ пачала поўнамаштабную вайну супраць Украіны, выкарыстаўшы ў тым ліку тэрыторыю Беларусі для нанясення ракетных удараў.

Так, улада рэжыма зусім не мірная.

# СЛОВА ПІСЬМЕННІКА

Рыгор Барадулін (на фота) — паэт міласцю Божай. Шмат хто адразу ўспомніць гэтыя радкі:

*Трэба дома
бываць часцей,
Трэба дома
бываць не госцем,
Каб душою
не ачарсцвець,
Каб не страціць
святое штосьці.*

Класік беларускай літаратуры. Філосаф беларускага жыцця. Гэта было яго апошняе інтэрв'ю. І ён яшчэ паспеў яго прачытаць у газеце 2 сакавіка 2014 года, за некалькі гадзін да смерці...

*— Дзядзька Рыгор, з якім настроем Вы цяпер жывяце?*

— Я заўсёды думаў, што 80 гадоў — гэта многа і, вядома, ніколі на сябе не прымяраў, а цяпер, калі мне самому столькі, дык адчуваю, што гэта ўсё-ткі мнагавата… Ну, колькі Бог дае, столькі і будзеш жыць, нікуды не ўцячэш, усе гады — плённыя яны ці не — усе яны твае. І чым меней застаецца тых гадоў, тым больш хочацца жыць. Гэта ў маладосці ніколі не задумваешся пра тое і перакананы, што яшчэ шмат часу наперадзе, што ўсё паспееш. А цяпер як паглядзіш, дык падаецца, што ў асноўным усё не тое рабіў у гэтым жыцці — шмат рабіў лішняга, пустога, неабавязковага. Але, з іншага боку, так ужо жыццё ўладкавана. Гэта ж не сцэнарый. Так ужо Бог даў.

*— Нядаўна Аляксандр Лукашук на Радыё «Свабода» распавёў пра кнігу аўстралійскай медсястры Броні Уэа «Пяць галоўных шкадаванняў людзей, якія паміраюць»: аўтар некалькі гадоў даглядала пацыентаў у апошнія тры месяцы іх жыцця, і высветлілася, што гэтыя людзі часта аднолькава выказваліся пра тое, што б яны зрабілі інакш у сваім жыцці. Дык вось галоўныя шкадаванні такія: шкада, што не хапіла смеласці пражыць жыццё ў згодзе з самім сабой, а не так, як чакалі іншыя; шкада, што шмат працавалі; шкада, што страцілі сувязь з сябрамі і што не дазволілі сабе быць больш шчаслівымі. А ці знаёмыя Вам гэтыя шкадаванні?*

— Шкадаванні знаёмыя, я гатовы да кожнага далучыцца і пад кожным распісацца. Гэта агульначалавечыя шкадаванні… Самае страшнае — застацца аднаму… Мне заўсёды хацелася вялікай сям'і, бо без сям'і мы — нічога… Мая мама, светлая ёй памяць, гаварыла, калі я быў яшчэ малады: «Каб быў з доўгай барадой і каб у цябе было многа ўнукаў, якія б цягалі цябе за бараду і мясілі табе клёцкі». «Мясіць клёцкі» — так у нас звычайна казалі, калі нехта нязлосна мясіў цябе кулачкамі ў жывот… Калі быў маладзейшы, дык у мяне было многа сяброў. Тыя ж Валодзя Караткевіч і Міхась Стральцоў былі для мяне як сям'я…

*— Між тым часу ад часу бываючы ў вас, не магу не адзначыць, што ў Вас з жонкай Валянцінай Міхайлаўнай сталі больш пяшчотныя адносіны. Ва ўсялякім выпадку, так збоку здаецца.*

— Можа быць, бо, разумееце, пад канец жыцця ў памяці ўсплывае ўсё-ткі ўсё добрае. Калі б не Валя, я загнуўся б ужо зусім.



*— Маладое пакаленне зробіць Беларусь сапраўды вольнай і незалежнай?*

— Так. Але, разумееце, у Беларусі дзвесце гадоў — яшчэ з часоў Каліноўскага — давілі, давілі, давілі…

*— Між тым нядаўна агучаны лічбы, колькі кніг было выдадзена ў Беларусі ў мінулым годзе, дык беларускіх выданняў усяго толькі два працэнты. Гэта ж не можа не бянтэжыць Вас?*

*— Усё, усё, канешне, ідзе да знішчэння: знішчаюцца школкі беларускія, знішчаюцца беларускія газеты, часопісы і выдавецтвы, і ўсё ідзе тут на расійскамоўны капыл.*

*Галоўная загадка беларусаў палягае ў тым, што іх быццам бы знішчаюць, а яны ўсё роўна не даюць абкрасці душу. Часам нават здаецца, што лепей было б, каб беларускую мову наогул забаранілі — тады б цікавасць да яе была яшчэ большая. А так атрымліваецца, нібыта на марудным агні смажаць.*

*— Ці былі сярод Вашых сяброў тыя, на каго Вы хацелі быць падобным?*

— Міхась Стральцоў, не кажу ўжо пра Караткевіча ці Някляева — гэта проста шалёны, ураганны шквал. Ну, і малады буранчык — Глеб Лабадзенка. Але я не хацеў бы абмяжоўвацца выключна гэтымі імёнамі, — маўляў, толькі яны ёсць і больш нікога няма. Ёсць і іншыя, проста я іх не ведаю.

Генадзь Бураўкін заўсёды быў за Беларусь і яшчэ раз за Беларусь. Гэта ж Бураўкін зрабіў нашы тэлебачанне і радыё беларускімі. Ужо не кажу пра творчасць Генадзя — пра яго паэзію і песні. Чаго вартая адна яго «Калыханка», якая выгадавала, відаць, цэлы мільён беларусаў!..

Уклад Бураўкіна ў незалежнасць Беларусі вялізны. І хоць сённяшнія чыноўнікі гэтага не помняць, але затое помніць Беларусь, тым больш што чыноўнікі змяняюцца, а Беларусь была, ёсць і будзе.

*— І ўжо на заканчэнне: што Вы пажадаеце, дзядзька Рыгор, маладзейшым за Вас?*

*— Маладым хочацца найперш сказаць, каб заставаліся самімі сабой. Грошы, слава — цяпер жа столькі спакус, і таму дужа цяжка выстаяць, але ўсё гэта сыдзе, і чалавек застанецца сам-насам.*

*Таму пажадаю: жывіце сэрцам, а не розумам.*

